# ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ НЕЗАЛЕЖНАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Новік Я.К., доктар гіст. н., прафесар, прафесар, e-mail: kafgumd@bsuir.by

Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі

Ключавыя словы: Рэспубліка Беларусь, Канстытуцыя, палітычны крызіс, абвяшчэнне, дасягненні.

Анатацыя: Артыкул прысвечаны распаду СССР і абвяшчэнню Рэспублікі Беларусь, прыняццю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, палітычнаму і гаспадарчаму крызісу першых гадоў незалежнасці. Асвячаюцца таксама асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця і галоўныя дасягненні суверэннай Рэспублікі Беларусь.

Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Распад СССР і яго прычыны. 1990 год стаў пераломным, лёсавызначальным годам у гісторыі Савецкай дзяржавы. Далейшы ход падзей быў лагічным працягам і завяршэннем таго, што адбылося менавіта ў гэты час.

Выбары ў рэспубліканскія і мясцовыя органы ўлады і дасягненне на гэтых выбарах поспехаў т. зв. «дэмакратамі» і нацыянальна арыентаванымі лідарамі, выключэнне з Канстытуцыі СССР яе 6-га артыкула аб кіруючай ролі КПСС, замацаванне ў новай платформе партыі палітычнага плюралізму, змешанай эканомікі і шматпартыйнасці, увядзенне пасады Прэзідэнта СССР і выбранне ім на безальтэрнатыўнай аснове М. Гарбачова, аб’яўленне нацыяналістамі Эстоніі, Азербайджана, Арменіі, Латвіі, Літвы, Грузіі і іншых рэспублік суверэнітэту сваіх рэспублік, што сведчыла аб здзяйсненні імі пры патуранні з боку саюзнага кіраўніцтва парламенцкіх пераваротаў, – усё гэта і многае іншае ўзмацняла «парад суверэнітэтаў», цэнтрабежныя тэндэнцыі ў краіне і ініцыіравала прыняцце падобных дэкларацый у іншых савецкіх рэспубліках.

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Савецкай Федэрацыі. Прынятае рашэнне супярэчыла волі большасці беларусаў, што была выказана падчас правядзення 17 сакавіка 1991 г. рэферэндуму па пытанні аб захаванні Савецкага Саюза. Беларускі народ не жадаў руйнавання СССР.

Распад СССР паскорылі падзеі, якія адбыліся ў Маскве з 19 па 21 жніўня 1991 г. і мелі мэтай не дапусціць падпісання новага саюзнага дагавора. Падчас адпачынку М. Гарбачова ў Крыме група вышэйшых дзяржаўных асоб (Г. Янаеў – віцэ-прэзідэнт СССР, В. Паўлаў – прэм’ер-міністр СССР, Б. Пуга – міністр унутраных спраў СССР, В. Кручкоў – старшыня КДБ СССР і інш.) стварылі Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ДКНС), абвясцілі аб хваробе М. Гарбачова і пераходзе ўлады ў свае рукі. Гэта вельмі нагадвала палітычную правакацыю [1, с. 356; 3, с. 471].

Пралік членаў ДКНС заключаўся ў недаацэнцы актыўнасці т. зв. «дэмакратычных сіл» і рашучасці асабіста Б. Ельцына. Ён як Прэзідэнт Расіі абвінавaціў кіраўніцтва КПСС у спробе дзяржаўнага перавароту і падпарадкаваў сабе ўсе органы выканаўчай улады СССР, якія знаходзіліся на тэрыторыі Расіі, у т. л. КДБ, МУС і Міністэрства абароны. Дзейнасць КПСС на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі была забаронена. Гэта таксама быў дзяржаўна-палітычны пераварот. Кіруючая партыя не толькі адхілялася ад улады, але і ўвогуле была ліквідавана.

Паражэнне путчу фактычна прывяло да краху цэнтральнай улады СССР, перападпарадкавання ўладных структур рэспубліканскім лідарам і паскарэння распаду СССР. Правал путчыстаў, прыпыненне ў жніўні і забарона ў лістападзе 1991 г. дзейнасці КПСС прывялі да таго, што не стала сілы, якая аб'ядноўвала саюзныя рэспублікі. Перамога Б. Ельцына напалохала камуністычную наменклатуру саюзных рэспублік, і яна падтрымала ідэю нацыянальна-дэмакратычных сіл аб абвяшчэнні незалежнасці сваіх рэспублік.

25 жніўня 1991 г. пятая нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла Закон «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР» і пастанову «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР». Былі ўнесены змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю БССР 1978 г. Ва ўласнасць рэспублікі перайшла агульнасаюзная маёмасць. Так юрыдычна была аформлена дзяржаўная незалежнасць Беларусі. Таксама пачаўся працэс дэпартызацыі, а дзейнасць КПСС-КПБ прыпынялася [1, с. 358; 3, с. 473].

З 17 па 19 верасня 1991 г. адбылася шостая нечарговая сесія Вярхоўнага Савета. На ёй 19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет прыняў Закон «Аб назве БССР», у адпаведнасці з якім яна пачала называцца «Рэспубліка Беларусь», а ў скарочаных назвах – Беларусь. Тады ж былі абвешчаны законы «Аб дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь» (бела-чырвона-белы), «Аб дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь» («Пагоня») [1, с. 358; 3, с. 473].

Ва ўмовах параду суверэнітэтаў, развіцця цэнтрабежных тэндэнцый у краіне, актывізацыі дзейнасці нацыяналістаў і сепаратыстаў узнікла рэальная пагроза існаванню СССР.

Аб'ектыўных прычын для краху, ліквідацыі Савецкага Саюза амаль не існавала. Гэта была вялікая і магутная шматнацыянальная дзяржава з сярэднім узроўнем матэрыяльнага дабрабыту людзей і даволі высокім узроўнем духоўна-культурнага развіцця. Да пачатку ажыццяўлення спробы перабудовы ўсе народы краіны жылі ў міры, сяброўстве і згодзе, большасць з іх была задаволена савецкім ладам жыцця.

Пры вырашэнні лёсу СССР воля народа, выказаная на ўсесаюзным рэферэндуме 17 сакавіка 1991 г., была праігнаравана. Аб'яднацца і выказацца супраць разбуральнікаў СССР савецкія людзі, у тым ліку і камуністы, не маглі, бо былі перакананы ў беспамылковасці дзейнасці партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва СССР. Выступленні супраць іх разглядаліся як

антыдзяржаўная і антыпартыйная дзейнасць з жорсткай крымінальнай адказнасцю. Ніхто не хацеў за гэта трапляць за турэмныя краты. Ігнараванне вышэйшым кіраўніцтвам СССР і КПСС волевыяўлення савецкага народа, выказанага на ўсесаюзным рэферэндуме 1991 г., – адна з галоўных суб'ектыўных прычын знішчэння СССР.

Ёсць яшчэ адна група суб'ектыўных прычын, якая прывяла да краху СССР. Вышэйшае дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва СССР не толькі патурала нацыянальна арыентаваным палітыкам, але і дазваляла сабе такія дзеянні, якія стваралі палітычную і прававую базу для ліквідацыі СССР. У 1989 г. быў прыняты Закон СССР «Аб парадку вырашэння пытанняў, звязаных з выхадам саюзнай рэспублікі з СССР». Механізм развалу краіны быў запушчаны.

8 снежня 1991 г. у Белавежскай пушчы (у Віскулях Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці) кіраўнікі Расіі, Беларусі і Украіны (Б. Ельцын, С. Шушкевіч, Л. Краўчук), ігнаруючы волю сваіх народаў, якая была выказана на агульнасаюзным рэферэндуме 17 сакавіка 1991 г., дэнансавалі дагавор 1922 г. аб утварэнні СССР і тым самым канчаткова знішчылі вялікую і магутную дзяржаву. Савецкі Саюз спыніў сваё існаванне. На руінах СССР была створана Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД). Дакументы сустрэчы ў Віскулях былі ратыфікаваны Вярхоўнымі Саветамі Расіі, Беларусі і Украіны, большасць дэпутатаў якіх складалі былыя камуністы [1, с. 362–363; 2, с. 220; 3, с. 473–474].

21 снежня 1991 г. на сустрэчы ў Алма-Аце кіраўнікі 11 рэспублік былога СССР падпісалі Дэкларацыю ў падтрымку Белавежскага пагаднення. Членамі СНД сталі ўсе былыя саюзныя рэспублікі, акрамя Літвы, Латвіі і Эстоніі [1, с. 363; 2, с. 221; 3, с. 474].

У сувязі з прыпыненнем існавання СССР 25 снежня 1991 г. прэзідэнт СССР М. Гарбачоў склаў свае паўнамоцтвы.

Калі узважыць усе вядомыя зараз абставіны, то можна вылучыць некалькі блокаў прычын развалу Савецкага Саюза, якія ўзаемазвязаныя паміж сабой: палітычныя, эканамічныя, знешнепалітычныя.

Галоўнымі прычынамі былі эканамічныя. Планавая адміністрацыйна-камандная эканоміка вяла да празмернага цэнтралізму ў кіраванні ўсёй народнай гаспадаркай. На месцах даводзілася ўзгадняць з цэнтрам нават самыя дробныя пытанні. Вертыкальнае размеркаванне, а таксама празмерная мілітарызацыя эканомікі выклікалі ўзнікненне хранічнага дэфіцыту тавараў шырокага ўжытку, што раздражняла людзей, выклікала незадаволенасць усім ладам жыцця [2, с. 221]. Да прычын гэтага блоку можна аднесці і глыбокі эканамічны крызіс, выкліканы неадназначнымі эканамічнымі рэформамі другой паловы 1980-х гг.

У ліку палітычных прычын можна адзначыць:

- супярэчнасці, першапачаткова закладзеныя ў палітычнай сістэме СССР;
- кансерватыўныя формы арганізацыі грамадства (кланавасць, пратэкцыянізм, бюракратызм);

- савецкі «федэралізм»: адсутнасць рэальнай роўнасці рэспублік, своеасаблівая нацыянальная палітыка, развіццё без уліку асабліввасцей кожнай рэспублікі, імкненне да стварэнне ўнітарнай дзяржавы і «савецкага народа»;
- аслабленне і дыскрэдытацыю цэнтральнай улады, барацьбу паміж цэнтрам і рэспубліканскімі ўладамі;
- нацыянальны сепаратызм у саюзных рэспубліках;
- раскол у партыйным кіраўніцтве, аслабленне КПСС;
- крызіс камуністычнай ідэалогіі, духоўны вакуум.

Час ад часу прадпрымаліся спробы рэформаў, аднак яны сутыкаліся з немагчымасцю пераадолення ідэалагічных догмаў. Аднапартыйная сістэма, пры якой уся ўлада належала КПСС, вяла да палітычнай стагнацыі. Калі кіраўнікі партыі здолелі пайсці на кампраміс, то аказалася, што час для такіх кампрамісаў ужо прайшоў [2, с. 221].

У ліку знешнепалітычных прычын можна ўзгадаць наступныя аспекты:
- «заходні след» (дзейнасць замежных спецслужбаў, накіраваная на аслабленне і развал СССР);
- вельмі моцна ўздзейнічала распачатая ў 1946 г. халодная вайна. Супрацьстаянне з Захадам і ўсім капіталістычным светам патрабавала вялікіх намаганняў і сродкаў. Савецкі Саюз аказаўся няздольным вытрымліваць такую напружаную барацьбу працяглы час. Трэба адзначыць, што заходнія, найперш амерыканскія, лідары гэта добра разумелі і пастаянна ўцягвалі СССР у гонку ўзбраенняў, што самым негатыўным чынам сказвалася на стане спраў унутры краіны;
- войны за межамі СССР (Савецкі Саюз пасля Вялікай Айчыннай вайны і Другой сусветнай вайны ўдзельнічаў больш чым у 30 узброеных канфліктах).

Такім чынам, спробы ажыццяўлення радыкальных змен у перыяд перабудовы выліліся ў эканамічны і палітычны крызіс, які прывёў да ліквідацыі СССР як адзінай дзяржавы і з’яўлення шэрагу незалежных краін, у т. л. Рэспублікі Беларусь.

Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Палітычны і гаспадарчы крызіс першых гадоў незалежнасці. 15 сакавіка 1994 г. Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў новую Канстытуцыю – Асноўны закон Рэспублікі Беларусь. Згодна з ёю, Беларусь з’яўляецца унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі. У рэспубліцы была ўведзена прэзідэнцкая форма кіравання [1, с. 367; 2, с. 224; 3, с. 477].

Першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 10 ліпеня 1994 г. быў выбраны А. Лукашэнка. Для забеспячэння эфектыўнай дзяржаўнай палітыкі была створана падпарадкаваная ўсенародна выбранаму Прэзідэнту скразная вертыкальная структура, якая ўключае выканаўчыя і распарадчыя органы як у цэнтры, так і на месцах [1, с. 367; 2, с. 224; 3, с. 477].

Пасля прэзідэнцкіх выбараў з восені 1994 г. у Беларусі пачаўся востры палітычны крызіс, які выразіўся ў супрацьдзеянні Прэзідэнта і Вярхоўнага

Савета. У Рэспубліцы Беларусь уводзіўся інстытут прэзідэнцтва, аднак рэсурсы і паўнамоцтвы ўлады Прэзідэнта былі абмежаванымі. Фактычна Беларусь стала парламенцка-прэзідэнцкай рэспублікай.

Неадпаведнасць функцый і паўнамоцтваў заканадаўчай і выканаўчай улады заключалася ў тым, што Вярхоўны Савет меў неабмежаваную магчымасць прымаць рашэнні па любым пытанні, вызначаць і змяняць паўнамоцтвы ўсіх іншых органаў улады, уносіць любыя змены ў Канстытуцыю і законы.

У той жа час Прэзідэнт вяртаў на дапрацоўку ў Вярхоўны Савет праекты законаў са сваімі прапановамі, спрабаваў накладваць вета, але Вярхоўны Савет пераадольваў прэзідэнцкае вета ў 100 % выпадкаў. У такіх умовах эфектыўна кіраваць эканомікай і забяспечваць палітычную і сацыяльную стабільнасць у дзяржаве было вельмі цяжка.

У мэтах пераадолення палітычнага крызісу Прэзідэнт выступіў з ініцыятывай правядзення рэспубліканскага рэферэндуму, куды выносіліся пытанні, па якіх у грамадстве вяліся актыўныя дыскусіі. Рэферэндум адбыўся 14 мая 1995 г. У ім прынялі ўдзел 64,8 % выбаршчыкаў, якія мелі права голасу. Вынікі галасавання сведчылі аб поўнай падтрымцы народам палітычнага курса новага кіраўніцтва дзяржавы. 83,3 % выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у рэферэндуме, падтрымалі прапанову аб наданні рускай мове статусу, роўнага з беларускай мовай. За падтрымку дзеянняў Прэзідэнта, накіраваных на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй, прагаласавала 83,3 % выбаршчыкаў. 77,7 % удзельнікаў галасавання пагадзілася з неабходнасцю ўнясення змен у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжвалі магчымасць датэрміновага прыпынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам у выпадках сістэматычнага і грубага парушэння парламентам Канстытуцыі. 75,1 % удзельнікаў галасавання падтрымалі прапанову Прэзідэнта аб устанаўленні ў Рэспубліцы Беларусь новых Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга. Герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг на рэферэндуме народам не былі прызнаны нацыянальнымі дзяржаўнымі сімваламі [1, с. 369; 2, с. 225–226; 3, с. 477].

Па-першае, як сведчаць першакрыніцы, герб «Пагоня» быў вядомы як герб ВКЛ ужо ў XIV ст. Але гэта не дае падстаў сцвярджаць, што ён з’яўляецца беларускім нацыянальным і дзяржаўным сімвалам, бо ВКЛ не было толькі беларускай дзяржавай, як пішуць некаторыя гісторыкі, а з’яўлялася поліэтнічнай дзяржавай продкаў чатырох асноўных народаў – беларускага, літоўскага, рускага і ўкраінскага, таму і герб «Пагоню» можна лічыць гістарычным сімвалам усіх гэтых чатырох народаў.

Па-другое, герб «Пагоня» – гэта рыцарскі сімвал воінскай славы, воінскай магутнасці, выява народнай традыцыі пагоні, якая была характэрнай не толькі для беларусаў ці літоўцаў, а для ўсіх тых, хто ваяваў, падвяргаўся нападу і рабіў пагоню за пераможаным ворагам ці ворагам, што адступіў без бітвы. А калі ў той час (XII–XIV стст.) ваявалі амаль усе – і народы Захаду, і народы Усходу, то і традыцыя народнай пагоні была традыцыяй і

усходнеславянскіх народаў і заходнееўрапейцаў, выява пагоні сустракаецца і на Усходзе, і на Захадзе.

Па-трэцяе, герб «Пагоня» не меў усебеларускага распаўсюджвання, аб чым сведчыць наступнае. Сярод 47 гербаў губерняў і гарадоў Беларусі, якія прыведзены ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, толькі 11 мелі выяву «Пагоні». У XVI–XVIII стст. з 70 гербаў гарадоў Беларусі знак «Пагоні» быў толькі ў пяці – Магілёва, Лепеля, Дрысы, Чэрыкава і Ліпнішак.

Па-чацвёртае, герб «Пагоня» ўзнік гістарычна, ён цалкам належыць сівой феадальнай даўніне. Як факт нашай гісторыі герб «Пагоня» можа выкарыстоўвацца ў прозе, вершах, кінастужках, тэатры, музыцы, архітэктуры, наогул, у жыцці беларускага народа, як і іншых народаў. Як культурна-гістарычны знак герб «Пагоня» – чысты. Як дзяржаўна-палітычны сімвал – заплямлены, бо ў 1941–1944 гг. знаходзіўся ў руках здраднікаў, катаў і ворагаў беларускага народа [1, с. 369–370; 3, с. 477–478].

Яшчэ менш даследаванай з'яўляецца праблема паходжання бела-чырвона-белага сцяга. Дакументаў амаль ніякіх няма. Ёсць толькі публікацыі тых, хто пад гэтым сцягам змагаўся за буржуазную будучыню Беларусі. Сярод іх прафесар-здраднік Р. Астроўскі (у гады Вялікай Айчыннай вайны служыў акупантам, узначальваў Беларускую цэнтральную раду). Ён у замежным часопісе «Беларуская думка» (1965, № 7) сцвярджаў, што «ўпершыню пытанне аб гербе і сцягу абмяркоўвалася на пасяджэнні Беларускага нацыянальнага камітэту ў Мінску ў сакавіку 1917 г. Менавіта ў гэты час вырашылі карыстацца «Пагоняй» і вядомым сцягам, узор якога быў прыняты тады ж. На сцягу зрабілі надпіс: «Няхай жыве вольная Беларусь». Як сведчыць інфармацыя часопіса, бела-чырвона-белага сцяга да таго часу ў беларусаў не існавала.

Яшчэ больш дакладная даведка ёсць у артыкуле Г. Альгердзіча (беларускі калабарацыяніст перыяду Вялікай Айчыннай вайны А. Адамовіч) у газеце «Раніца» (месца выдання – Берлін) за 26 лістапада 1944 г. У ім напісана: «Паходжанне нашага сённяшняга бела-чырвона-белага сцягу параўнальна нядаўняе і звязана з часам рэвалюцыі 1917 г. таму, што пытанне аб агульнанацыянальным ці дзяржаўным сцягу ў мінуўшчыне было недаследаваным. А нашым нацыянальным дзеячам 1917 г. і зусім невядомым. Давялося ім выступіць у гэтай галіне вольнымі творцамі. У выніку гэтай творчасці адразу з'явіўся быў у якасці нацыянальнага сцягу аднаколерны белы штандар. Відаць, у прызнанні яго за нацыянальны сцяг кіраваліся расшыфраваннем самога назову «Беларусь». Аднак хутка выявілася неадпаведнасць такога аднаколернага белага сцягу: ён занадта біў у вочы на фоне рэвалюцыйнага разумення сымболікі колераў (чырвонае – колер рэвалюцыі, белае – колер контррэвалюцыі). Да таго ж, аддаўна меў міжнароднае значэнне знаку паддачы, капітуляцыі на вайне. Таму неўзабаве пасярод белае палатніны сцягу была праведзена чырвоная, «рэвалюцыйная» паласа. Гэтак і з'явіўся наш сённяшні сцяг».

Артыкул А. Адамовіча быў надрукаваны ў 1944 г., калі яшчэ былі жывымі многія беларускія дзеячы 1917–1920 гг., функцыянеры БНР, якія б маглі не пагадзіцца, паправіць аўтара, калі б была надрукавана няпраўда.

Такім чынам, герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг з'яўляюцца не нацыянальнымі сімваламі, а сімваламі барацьбы за ўладу пэўных палітычных сіл, не падтрыманых большасцю беларускага народа. Герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг – сімвалы буржуазнай Беларусі, чырвона-зялёны сцяг з белым арнаментам і герб з сярпам і молатам – сімвалы Савецкай Сацыялістычнай Беларусі.

Выбіраючы сімвалы Рэспублікі Беларусь, большасць народа зыходзіла з таго, што дзяржаўныя герб і сцяг павінны быць незаплямленымі, чыстымі, не звязанымі ў думках беларусаў са злачынствамі і генацыдам перыяду Вялікай Айчыннай вайны. На рэферэндуме 1995 г. большасць народа выказалася за новую сімволіку, якая ўяўляе сабой крыху зменену дзяржаўную сімволіку Савецкай Беларусі [1, с. 370–371; 3, с. 478–479].

Аднак і пасля рэферэндуму 14 мая 1995 г. супрацьстаянне Вярхоўнага Савета і Канстытуцыйнага суда з Прэзідэнтам працягвалася. Прэзідэнцкімі ўказамі забаранялася пасрэдніцтва і камерцыйная дзейнасць у дзяржаўных структурах, прадухілялася неабгрунтаваная прыватызацыя па заніжаным кошце з парушэннем заканадаўства. За 1995 г. Канстытуцыйны суд адмяніў 18 прэзідэнцкіх указаў. Прэзідэнт выдаў распараджэнне ўказы выконваць «да ўнясення змяненняў у заканадаўства».

Да лета 1996 г. канфлікт Прэзідэнта і Вярхоўнага Савета пераўтварыўся ў канфрантацыю. Патрабавалася правесці змены ў заканадаўстве краіны, якія датычыліся б пераразмеркавання ўладных паўнамоцтваў. 8 жніўня 1996 г. А. Лукашэнка звярнуўся ў Вярхоўны Савет з прапановай правядзення рэспубліканскага рэферэндуму па наступных пытаннях: аб папраўках у Канстытуцыю, аб перанясенні Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь на 3 ліпеня – дзень вызвалення Мінска ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне; аб свабоднай, без абмежаванняў, куплі і продажы зямлі; аб адмене смяротнай кары [1, с. 372; 2, с. 226; 3, с. 480].

Кожны з канфліктуючых бакоў вырашыў вынесці на рэферэндум свой варыянт паправак у Канстытуцыю. Прэзідэнцкі праект прадугледжваў пазбаўленне Вярхоўнага Савета многіх уладных паўнамоцтваў на карысць Кіраўніка дзяржавы, а парламенцкі праект прадугледжваў ліквідацыю нават пасады Прэзідэнта. Стваралася рэальная пагроза дэстабілізацыі палітычнай сітуацыі ў Беларусі.

У такіх умовах Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выступіў з ініцыятывай склікання Усебеларускага народнага сходу (УНС) – органа шырокага народаўладдзя, аднаго з асноўных палітыка-ідэалагічных і дэмакратычных інстытутаў у краіне.

Першы УНС працаваў у Мінску, у Палацы спорту, 19–20 кастрычніка 1996 г. На сход прыехала каля 5000 дэлегатаў, выбраных працоўнымі калектывамі ад усіх класаў і пластоў насельніцтва, а таксама рэгіёнаў Беларусі. Удзельнікі сходу 4990 галасамі падтрымалі ўнутраную і знешнюю

палітыку, якую праводзіла кіраўніцтва краіны (супраць галасавалі толькі 11 дэлегатаў), выступілі супраць дзеянняў Вярхоўнага Савета на канфрантацыю, а таксама палітычных заяў Канстытуцыйнага суда і яго кіраўніцтва, якія не адпавядалі канстытуцыйнаму статусу гэтага органа.

Другі ўсебеларускі рэферэндум адбыўся 24 лістапада 1996 г. За прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі, прапанаванымі Прэзідэнтам, прагаласавалі 70,45 % выбаршчыкаў. Супраць свабоднай куплі-продажу зямлі выказалася 82,88 % выбаршчыкаў, супраць адмены смяротнай кары – 80,44 % [2, с. 226].

На рэферэндуме была падтрымана прапанова А. Лукашэнкі аб перанясенні Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дня Рэспублікі) з 27 ліпеня на 3 ліпеня. Дзень 27 ліпеня ў памяці людзей звязваецца з некаторымі змрочнымі падзеямі ў айчыннай гісторыі. 27 ліпеня 1942 г. кат беларускага народа, гаўляйтар В. Кубэ, падтрымаў беларускіх здраднікаў і выдаў распараджэнне, якім дазволіў «пры розных урачыстасцях і для распазнавання нацыянальнасці беларускай побач з нямецкімі адзнакамі на дамах вывешваць і насіць бела-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоню». Менавіта ў гэты дзень (выпадкова ці наўмысна), 27 ліпеня 1990 г. была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. З гэтым днём і з гэтым дакументам большасць народа звязваў не толькі крок да поўнай незалежнасці Беларусі, але і да развалу вялікай і магутнай дзяржавы – Савецкага Саюза. Беларускі народ адмовіўся ад таго, каб дзень 27 ліпеня і далей лічыць сваім галоўным дзяржаўным святам – Днём незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Днём Рэспублікі) [1, с. 372; 3, с. 480].

27 лістапада 1996 г. Прэзідэнт падпісаў новую рэдакцыю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Замест аднапалатнага Вярхоўнага Савета быў сфарміраваны двухпалатны парламент – Нацыянальны сход, які з гэтага часу складаўся з Палаты прадстаўнікоў (110 дэпутатаў, абраных насельніцтвам) і Савета Рэспублікі (у ім засядалі па восем чалавек ад кожнай вобласці і г. Мінска, і восем чалавек, прызначаных Прэзідэнтам). Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь стаў дзяржаўным інстытутам, які прымае выверанyя і ўзгодненыя з іншымі галінамі ўлады рашэнні.

Узрасла роля Урада – Савета Міністраў – у сістэме галін улады і ўзмацнілася яго адказнасць за стан і развіццё эканомікі, сацыяльна-культурнай і адміністрацыйна-палітычнай сфер дзейнасці. Быў заснаваны новы кантрольны орган – Камітэт дзяржаўнага кантролю (замест Кантрольнай палаты). Канстытуцыйны Суд быў уключаны ў сістэму судовай улады (раней уваходзіў у сістэму кантролю і нагляду).

Такім чынам, воля народа, выяўленая на рэферэндумах 1995 і 1996 гг. і падчас першага УНС 1996 г., адыграла гістарычную ролю ў мірным вырашэнні крызісу сярэдзіны 1990-х гг., які склаўся ў Беларусі, і лягла ў аснову эканамічнай і сацыяльнай палітыкі, якую праводзіла кіраўніцтва дзяржавы.

Асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця Рэспублікі Беларусь у пачатку XXI ст. Некаторыя важныя дасягненні суверэннай Рэспублікі

Беларусь. У грамадска-палітычным жыцці суверэннай Рэспублікі Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст. можна вызначыць тры этапы. Храналагічныя рамкі першага з іх – 1991–1994 гг. Гэта быў этап пошукаў, няўдач і расчараванняў. Здабыткаў не было амаль ніякіх. Сярэдняя месячная зарплата ў большасці працаўнікоў складала 20–30 долараў ЗША ў эквіваленце, а ў значнай часткі яшчэ ніжэй – 15–20 долараў ЗША. Насельніцтва намагалася выжыць ва ўмовах рыначнага капіталізму.

Другі этап працягваўся з 1994 па 2019 г. Гэта быў этап найбольш плённага развіцця Рэспублікі Беларусь, у тым ліку і яе грамадска-палітычных каштоўнасцяў. Грамадска-палітычныя працэсы і падзеі развіваліся ва ўмовах у цэлым устойлівага эканамічнага росту ў рэспубліцы.

Трэці этап ахоплівае 2020 г. і наступныя гады, калі ў Рэспубліцы Беларусь узнік глыбокі палітычны крызіс, які выліўся ў тое, што беларуская апазіцыя, прафінансаваная і падтрыманая знешнімі фінансавымі коламі і спецслужбамі, найперш амерыканскімі, зрабіла няўдалую спробу здзейсніць антыканстытуцыйны дзяржаўны пераварот, сілавым шляхам захапіць уладу, змяніць дзяржаўны і грамадскі лад, а таксама сацыяльную накіраванасць нашай дзяржавы. Мяцеж апазіцыі не быў падтрыманы беларускім народам і пацярпеў паражэнне.

У сувязі з глыбокім палітычным і канстытуцыйна-дзяржаўным крызісам у краіне была абмеркавана праблема павышэння ролі УНС як інструмента вырашэння самых супярэчлівых, складаных, лёсавызначальных для Рэспублікі Беларусь пытанняў.

Упершыню ў айчыннай гісторыі Беларусі Народны сход склікаўся і працаваў 28–30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку ў сувязі з неабходнасцю вырашэння лёсу заходнебеларускіх зямель пасля іх вызвалення ад польскага прыгнёту. Гэты сход тады называўся Народным сходам Заходняй Беларусі. Ён прыняў лёсавызначальныя для Беларусі і беларускага народа Дэкларацыю аб дзяржаўнай уладзе і Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад Беларускай ССР. Быў пакладзены канец падзелу беларускага этнасу і беларускай этнічнай тэрыторыі. Ажыццявілася мара беларускага народа жыць у адзінай беларускай нацыянальнай дзяржаве.

Ідэя склікання Народнага сходу ў 1990-я гг. узнікла тады, калі ў краіне з'явіўся глыбокі палітычны і канстытуцыйны крызіс і для яго вырашэння патрэбна было задзейнічаць не толькі сотні дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі, але і тысячы лепшых працаўнікоў, якіх накіруе беларускі народ у якасці дэлегатаў сходу. Ідэя аказалася ўдалай. За час існавання суверэннай Рэспублікі Беларусь было склікана сем УНС, на якіх падводзіліся вынікі выканання заданняў папярэдніх пяцігадовых планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і вызначаліся асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступныя пяцігодкі.

Аднак Народны сход існаваў у якасці грамадскага палітыка-дэмакратычнага фарміравання. Яго роля і паўнамоцтвы ў Канстытуцыі і заканадаўстве Рэспублікі Беларусь не былі прапісаны.

У сувязі з глыбокім палітыка-канстытуцыйным крызісам была абмеркавана разумная ідэя аб наданні УНС паўнамоцтваў самага дэмакратычнага, дзяржаўна-прававога фарміравання Рэспублікі Беларусь, якое будзе вырашаць пытанні выключнай вартасці для Беларусі, напрыклад, аб вайне і міры, аб заключэнні лёсавызначальных пагадненняў з замежнымі краінамі, аб змене дзяржаўнага і грамадскага ладу, аб сацыяльных заваёвах грамадзян, аб прыватызацыі і г. д.

У Рэспубліцы Беларусь на пачатку 2022 г. працягвалася работа над праектам змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, які ў далейшым быў вынесены на рэспубліканскі рэферэндум. Працавала Канстытуцыйная камісія, створаная Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Апошняе слова ў законатворчасці па ўсіх канстытуцыйных пытаннях, у тым ліку і аб лёсе УНС, сказаў беларускі народ на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 г. [2, с. 227].

Важнымі падзеямі грамадска-палітычнага жыцця Рэспублікі Беларусь з’яўляліся выбары Прэзідэнта, дэпутатаў парламента і мясцовых Саветаў, а таксама рэспубліканскія рэферэндумы.

11 лютага 2000 г. быў прыняты Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, якім рэгуляваліся адносіны ў час падрыхтоўкі і правядзення выбараў, а таксама ўстанаўліваліся гарантыі свабоднага волевыяўлення грамадзян.

Палітычная падтрымка большасцю насельніцтва палітычнага курсу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, яго перамога на прэзідэнцкіх выбарах 9 верасня 2001 г., давала магчымасць пераадолець зафіксаванае Канстытуцыяй абмежаванне знаходжання адной і той жа асобы на прэзідэнцкай пасадзе не больш двух тэрмінаў. Зыходзячы з гэтага, 7 верасня 2004 г. Прэзідэнт выдаў указ «Аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму», на які выносілася пытанне: «Ці дазваляеце Вы першаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка ўдзельнічаць у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах Прэзідэнта і ці прымаеце частку першую артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: «Прэзідэнт выбіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні».

У галасаванні на рэферэндуме прыняло ўдзел 90,28 % ад колькасці грамадзян, унесеных у спіс для галасавання. З іх 79,42 % прагаласавала за прыняцце рашэння па прапанаваным Прэзідэнтам пытанні. Па выніках рэферэндуму адпаведныя змены былі ўнесены ў Канстытуцыю, што дазволіла дзеючаму Прэзідэнту балаціравацца на трэці і наступныя тэрміны [1, с. 373; 2, с. 227; 3, с. 481].

У сувязі з тым, што ў цэнтры беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь знаходзіцца Чалавек з яго інтарэсамі, жаданнямі і памкненнямі, у матэрыялах і рашэннях усіх сямі УНС, ва ўсіх беларускіх пяцігодках гэтая праблема з’яўлялася цэнтральнай. Так, трэці УНС 2–3 сакавіка 2006 г. у якасці першачарговай задачы наступнай пяцігодкі (2006–2010 гг.) вызначыў

кардынальнае павышэнне якасці жыцця людзей, галоўным лозунгам: «Дзяржава − для народа». Сярод прыярытэтаў наступнай пяцігодкі – усебаковае развіццё чалавека, рост рэальных даходаў насельніцтва, інавацыйнае развіццё эканомікі, энерга- і рэсурсазберажэнне, рост экспарту і павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, развіццё АПК, адраджэнне сяла, будаўніцтва жылля і развіццё малых гарадоў [1, с. 373; 3, с. 481].

Выбары Прэзідэнта, дэпутатаў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў заўсёды праводзіліся ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам, адпавядалі дэмакратычным нормам, былі празрыстымі і адкрытымі. У час прэзідэнцкіх выбараў за кандыдатуру А. Лукашэнкі галасавала 80 і больш працэнтаў выбаршчыкаў. Усе разам астатнія прэтэндэнты на пасаду Прэзідэнта маглі сабраць толькі крыху больш 10 % галасоў.

Агульны палітычны фон выбарчых кампаній у Беларусі настойліва спрабавалі вызначаць замежныя фінансавыя донары беларускай апазіцыі, т. зв. «свабодных» СМІ і «незалежных» грамадскіх арганізацый. У 2006 г. апазіцыя пры падтрымцы шэрагу заходніх краін і міждзяржаўных аб’яднанняў ажыццявіла першую спробу змены ўлады ў Беларусі шляхам прымянення тэхналогій «каляровых» рэвалюцый.

Беларуская апазіцыя на ўсіх выбарах цярпела сакрушальнае паражэнне і адказвала на гэта грубым парушэннем Канстытуцыі і заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Пацярпеўшы паражэнне на прэзідэнцкіх выбарах 19 снежня 2010 г., беларуская апазіцыя па традыцыі пайшла на несанкцыянаваную акцыю, якая пачалася на Кастрычніцкай плошчы г. Мінска. Затым калона дэманстрантаў пачала рух да плошчы Незалежнасці, дзе частка дэманстрантаў зрабіла спробу сілавога пранікнення ў будынак Дома ўрада. Органамі правапарадку гэтыя дзеянні былі прыпынены: ўзбуджана крымінальная справа. На працягу 19–20 снежня 2010 г. былі арыштаваны актыўныя ўдзельнікі акцыі, у лік якіх увайшлі сем з 10 кандыдатаў у прэзідэнты, а таксама іх саратнікі па выбарчай кампаніі. Пяць з сямі затрыманых кандыдатаў былі асуджаны да розных тэрмінаў пазбаўлення свабоды.

Унутрыпалітычныя працэсы, якія адбываюцца ў Беларусі, сведчаць, што ў нашай краіне сфарміраваныя ўсе ўмовы для папярэджання ці нейтралізацыі розных пагроз нацыянальнай бяспецы. Улада робіць усё для таго, каб забяспечыць электаральны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь, праводзіць выбары спакойна, адкрыта і аб’ектыўна. Сведчаннем гэтага стала электаральная кампанія 2024 г.

25 лютага 2024 г. у адзіны дзень галасавання адбыліся выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і дэпутатаў мясцовых Саветаў. Да часу выбараў былі прыняты змяненні і дапаўненні ў законы аб статусе дэпутатаў абедзвюх палат Парламента, а таксама ў Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь.

24–25 красавіка 2024 г. у новым канстытуцыйным статусе сабраўся сёмы УНС, праца якога прайшла пад лозунгам «Час выбраў нас». Дэлегатамі УНС былі зацверджаны Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі і Ваенная дактрына Рэспублікі Беларусь.

Выступаючы 18 мая 2001 г. на другім Усебеларускім народным сходзе, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка так ахарактарызаваў перамены, якія адбыліся ў краіне: «Упершыню за шматвяковую гісторыю нашага народа Беларусь адбылася як незалежная і самастойная дзяржава… Мы стварылі эфектыўную дзеючую сістэму дзяржаўнага кіравання – «вертыкаль улады»… Мы захавалі і ўмацавалі структуры забеспячэння нацыянальнай бяспекі і абароназдольнасці краіны. Мы зберaглі краіну ад мафіёзных кланаў, не далі крыміналу стаць палітычнай сілай і прарвацца ва ўладу. У краіне няма разрухі, карупцыі, разбою, беспарадку і беззаконня. Мы прыпынілі галапіруючую інфляцыю, скарацілі дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту. І гэта без дапамогі. Мы не разбазарылі народнае багацце, не нахапаліся замежных займаў, не ўлезлі ў даўгі, вяртаць якія прыйшлося б дзецям і ўнукам. Мы абаранілі і развілі сацыяльныя гарантыі для людзей – жыллё, пенсіі, бясплатныя за кошт бюджэту адукацыя і лячэнне. Мы замацавалі, развілі станоўчыя тэндэнцыі да ўстойлівага эканамічнага росту».

Яшчэ большых дасягненняў Рэспубліка Беларусь дабілася за апошнія гады. Яна стала касмічнай дзяржавай. Разам з Расійскай Федэрацыяй беларускія вучоныя, інжынеры і тэхнікі распрацоўваюць і ажыццяўляюць касмічныя праграмы і праекты, а беларускі спадарожнік з калязямной арбіты выдае на Зямлю інфармацыю, выкарыстанне якой забяспечвае больш паспяховае развіццё многіх галін гаспадаркі, навукі і культуры. Плануецца запуск новых, больш дасканалых касмічных аб’ектаў.

Рэспубліка Беларусь стала не толькі касмічнай, але і ядзернай дзяржавай. Завершана будаўніцтва другога ядзернага рэактара Беларускай атамнай электрастанцыі, што на тэрыторыі Гродзеншчыны. Зараз Беларуская АЭС выведзена на поўную магутнасць і працуе на карысць беларускай краіны і яе народа.

Існуе Парк высокіх тэхналогій у Мінску, дзе выкарыстоўваюцца тэхналогіі будучага, выпускаецца канкурэнтназдольны прадукт, які карыстаецца попытам на сусветным рынку, ствараюцца ўмовы для пeратварэння Рэспублікі Беларусь у Лічбавую краіну, краіну ў перспектыве з інфармацыйна-касмічнымі тэхналогіямі.

Мадэрнізацыя абсталявання лесаперапрацоўчых прадпрыемстваў, пераарыентацыя прадпрыемстваў краіны на выкарыстанне ў першую чаргу мясцовай беларускай сыравіны дазволіла выпускаць канкурэнтназдольную прадукцыю.

Пачуццё гонару за Беларусь і Кітай выклікае дзейнасць беларуска-кітайскага прадпрыемства «Вялікі камень», а таксама будаўніцтва каля гарадскога пасёлка Рудзенск, што за 40 км ад Мінска, буйнейшага ў Еўропе прадпрыемства па вытворчасці мікрабіялагічнай прадукцыі.

Значныя дасягненні ёсць ў дзейнасці беларускіх машынабудаўнікоў, калектываў прадпрыемстваў хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці, беларускіх шахцёраў з г. Салігорска і інш. У Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца будаўніцтва двух новых камбінатаў па вытворчасці калійных угнаенняў. Прамысловыя і горназдабываючыя прадпрыемствы Беларусі паспяхова канкурыруюць на сусветным рынку, а некаторыя з іх займаюць значныя сегменты ў яго структуры.

Паспяхова развіваецца аграпрамысловы комплекс Беларусі. Цалкам забяспечана харчовая бяспека краіны і на мільярды долараў прадаецца штогод прадукцыі аграпрамысловага комплексу на сусветным рынку.

Пераадольваючы штучна створаныя Захадам перашкоды і цяжкасці, ажыццяўляючы імпартазамяшчэнне, Рэспубліка Беларусь разам з Расійскай Федэрацыяй упэўнена крочаць у будучыню.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Гісторыя Беларусі : падручнік : у 2 ч. / Я. К. Новік [і інш.] ; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – 2-е выд. – Мінск : Выш. шк., 2006. – Ч. 2 : Люты 1917 г. – 2004 г. – 2006. – 471 с.

2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / [І. А. Марзалюк і інш.] ; пад агульнай рэдакцыяй І. А. Марзалюка. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.

3. Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі : Ад старажытных часоў – па 2008 г. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Вышэйшая школа, 2009. – 512 с.